# З гісторыяй на «Вы»

Уся друкаваная прадукцыя (акрамя раённых газет і нефармальных выданняў), што тычыцца гісторыі, а таксама крыніцазнаўства, дыпламатыі, археаграфіі, геральдыкі, нумізматыкі і г. д., згадваецца ў бібліяграфічным паказальніку «Новая літаратура па гісторыі і гістарычных навуках», складзеным Г. Антонавай і выпушчаным Дзяржаўнай бібліятэкай імя У. І. Леніна Рэспублікі Беларусь. Часава публікацыі абмежаваны 1990 годам (дарэчы, неаднаразова згадваецца і «ЛіМ»). З іх бачна, наколькі больш пільна пачалі прыглядацца мы да свайго далёкага мінулага (ці не таму так шмат пісалася пра Усяслава Чарадзея, Ефрасінню Полацкую, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Кірылу Тураўскага і іншых) і як уважліва пераасэнсоўваем падзеі больш блізкія (згадкі пра В. Кнорына, П. Машэрава).

У бібліятэцы даведнік выстаўлены для карыстання на відным месцы.